*Вячаслаў Калацэй*

**УНЁСАК БРАТОЎ ЛУЦКЕВІЧАЎ У РАЗВІЦЦЁ ЭТНАМАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ І ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ БЕЛАРУСІ**

*У артыкуле разгледжаны наступствы для айчыннага этнакультурнага выхавання, а таксама этнамастацкай адукацыі дзейнасці Антона і Івана Луцкевічаў – асоб, унёсак якіх у станаўленне дзяржаўнасці Беларусі палітолагі ацэньваюць досыць высока. Але, па меркаванні аўтара, некаторыя менш вывучаныя іх пачынанні адыгралі ў гісторыі краіны таксама значную і вартую даследавання ролю.*

*Viachaslau Kalatsei*

**BROTHERS LUTSKEVICHS CONTRIBUTION TO THE DEVELOPMENT OF THE ETHNO-ART EDUCATION AND ETHNO-CULTURAL TRAINING IN BELARUS**

*Historians and political scientists appreciate the contribution of Anton and Ivan Lutskevichs to the formation of the statehood of Belarus. The author of the article considered the genesis and consequences of the activity of the Lutskevich brothers for ethnocultural education and ethno-art education of Belarus. The author concludes that some of the less studied undertakings of the brothers played a significant and worthy role in the history of the country.*

Па трывалай традыцыі ў студзені бягучага 2019 года студэнты і выпускнікі кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ), якія доўжаць творчыя сувязі са сваёй alma mater удзелам у канцэртах і перформансах ансамбля беларускай музыкі «Талака», наведалі Вільнюскую гімназію імя Францішка Скарыны, каб напярэдадні 100-годдзя гэтай навучальнай установы адсвяткаваць з яе навучэнцамі і выкладчыкамі Зімовыя Святкі.



Малюнак 1 – Брама колішніх Базыльянскіх муроў, Вільнюс, Aušros Vartų gatvė-7 B, 2018



Малюнак 2 – Браты Іван і Антон Луцкевічы, Вільня, пач. XX ст.

Акурат 100 гадоў таму ўзімку 1919 года ў тагачаснай Вільні была ўпершыню адкрыта беларуская гімназія, якая першапачаткова праіснавала 25 год, да 1944-га. Яе адкрывалі 1 лютага 1919 года ў будынку праваслаўнай духоўнай семінарыі на тэрыторыі комплексу Базыліянскага кляштара, т. зв. «Базыльянскіх муроў» (мал. 1). Муры знаходзяцца побач з шануемай трыма народамі (беларусамі, летувісамі і палякамі) Вострай Брамай, апетай Максімам Багдановічам (1891–1917). Паводле класіфікацыі брытанскага даследчыка Роберта Грэйвза (1895–1985) М. Багдановіча (рана памерлага паэта, у творчасці якога рэльефна праходзіць тэма непадзеленага ўзвышанага кахання да жанчыны і цыклічнай неўміручасці прыроды) правамочна лічыць ярка выражаным майстрам містычнай «мовы паэтычнага міфа, якая застаецца мовай сапраўднай паэзіі» [1, с. 8]. Паводле Р. Грэйвса, мова паэтычнага міфа (ад з'яўлення амаль першых сакральных маўленчых практык палеаліту і – дагэтуль) скіравана на ключавыя для касмалогіі і метафізікі рэчы, а таксама выклікана ўплываць на людзей, з'явы, рэчы і ландшафты, пра якія апавядае паэт (філід, друід, бард) з мэтай сакралізацыі жыцця, захавання няспыннасці яго працэсаў [1, с. 24–25].

Магчыма, з-за моцнай энергетыкі ландшафту з пабудовамі па Aušros Vartų gatvė-7 B, праяўленай напачатку XX стагоддзя, а таксама незадаволенай тагачаснай патрэбы ў этнаскіраванай адукацыі і выхаванні мясцовай супольнасці беларусаў, новаадкрытая навучальная ўстанова неўзабаве дала Беларусі і Свету літаральна сузор'е бліскучых імёнаў. Шэраг вядомых беларусаў: дзеячаў мастацтва, навукоўцаў, інжынераў, медыкаў – былі выпускнікамі гімназіі. Выкладалі ў ёй такія выбітныя асобы, як: энцыклапедычна адукаваны мастак-касміст і «ікона» знаўцаў айчыннай інсітнай творчасці Язэп Драздовіч (1888–1954); будучы сусветнавядомы амерыканскі вучоны беларускага паходжання, вынаходнік касмічнага паліва на аснове вадкага вадароду (у тым ліку для астра-станцый сістэмы «Shuttle») Барыс Кіт (1910–2018); паэт і грамадскі дзеяч Максім Танк (1912–1995); рэфарматар нацыянальнай граматыкі беларусаў Браніслаў Тарашкевіч (1892–1938); заснавальнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першай беларускай спеўнай капэлы, этнамузыколаг, «спадкаемны» вязень спачатку – дэфензівы, потым – НКУС, а пазней – народны артыст СССР Рыгор Шырма (1892–1978) і інш.

Адкрывалі гімназію два надзвычай аўтарытэтныя ў грамадска актыўных колах тагачаснай мультыкультурнай Вільні чалавекі: браты Іван і Антон Луцкевічы (мал. 2), адыграўшыя на мяжы XIX–XX стагоддзяў значную ролю ў станаўленні беларусаў як нацыі, аб'яднанай дадзеным этнонімам. Трэба адзначыць, што этнонімы «ліцьвіны» ды «краёўцы» ў часы актыўнасці Луцкевічаў ужываліся ўжо досыць абмежавана, а вызначэнне «крывічы» (паралельнае з перманентнай характарыстыкай беларусаў як baltkrevi ў латышскай мове), прапануемае іх калегам, а таксама перыядычным апанентам, гісторыкам і філолагам, акадэмікам Вацлавам Ластоўскім (1883–1938) яшчэ не набыла актыўнага ўжытку. Звяртаючыся да сакралізаванай гісторыі еўрапейскіх дзяржаў, паводле асацыяцый ды аналогій, можна сказаць, што Луцкевічы – гэта, у пэўнай ступені, Ромул і Рэм (Кастар і Полукс, Хенгіст і Хорса і г. д.) кансалідацыі і самавызначэння нашага народа. На жаль, 1919-ты стаўся для малодшага з братоў – Івана – апошнім годам жыцця, але, як наступства, побач з яшчэ маладой гімназіяй, у 1921 годзе з'явіўся «Беларускі музей у Вільні», які стаў насіць яго імя. Музей імя Івана Луцкевіча праіснаваў у Вільні да 1944 года, карыстаўся стабільнай павагай наведвальнікаў і спецыялістаў, потым – па частках быў «распушчаны» ў фондах шэрагу нацыянальных музеяў ЛССР і БССР. Зараз беларуская супольнасць суверэннай Летувы (якая адмаўляецца ад дэфініцыі «дыяспара», бо лічыць беларусаў, поруч з іншымі этнасамі, аднымі з карэнных жыхароў Віленскага краю) карэктна, але настойліва спрабуе наладзіць рэстытуцыю яго экспанатаў, а таксама, аднаўленне афіцыйнага статусу.

Варта адзначыць, што Іван Луцкевіч (1881–1919) – не толькі адзін са стваральнікаў віленскага кола беларускай народнай асветы і культуры мяжы XIX–XX стагоддзяў, але і яго сапраўдны «стартавы рухавік», заканадаўца традыцый і метадаў пераемнасці этнакультурнай і этнамастацкай спадчыны паміж генерацыямі беларусаў. Іван вучыўся ў Вене, Санкт-Пецярбургу і Маскве, быў антыкварам, археолагам, публіцыстам, даследчыкам-арыенталістам і надзвычай актыўным грамадскім дзеячом, творчай, харызматычнай, markup-free рознабакова адоранай асобай, і, як многія геніі, пражыў няшмат. Сучаснікі, ведаўшыя яго, шкадавалі аб адным: Іван не любіў запісваць уласныя ідэі, думкі і веды; аддаваў перавагу передачы іх пры асабістым непасрэдным кантакце людзям, зацікаўленым і прынцыпова схільным да такога пераймання. А кола такіх неафітаў, у выніку, атрымалася хаця і надзвычай буйным (для персанальных паслядоўнікаў аднога чалавеку як крыніцы этнаадцэнтраванага светапогляду), але (ў нацыянальным кантэксце) не надта шырокім, паколькі Іван Луцкевіч досыць рана памёр.

Антон Луцкевіч (1884–1942) – выдатны лінгвіст, публіцыст, палітык і дыпламат – пражыў значна больш, быў ініцыятарам абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года, яе міністрам замежных спраў і, нават, прэм'ер-міністрам. Яго палітычная кар'ера скончылася ў 1920 годзе, калі ён зыйшоў у адстаўку, але культурна-асветная – цягнулася на карысць Беларусі яшчэ значны час – да яго смерці ў 1939 годзе. Антон пэўны час выкладаў віленскім гімназістам-беларусам іх мову. Але, дзякуючы канцэпцыі беларускай гімназіі, распрацаванай братамі Луцкевічамі, знаёмства з мовай і літаратурай свайго народу для яе выхаванцаў – далёка не фінал (як для большасці дзяцей сучасных беларусаў) паглыблення ў нематэрыяльную культурную спадчыну ўласнага народу.

У віленскай беларускай гімназіі першай паловы XX стагоддзя дзейнічаў спеўны калектыў (вядома, з рэпертуарам, заснаваным на беларускіх песнях, паколькі з Р. Шырмам у якасці настаўніка спеваў іншага не прадбачылася), гімназісты збіралі добра сістэматызаваныя этнаграфічныя калекцыі інсітных мастацкіх артэфактаў Беларусі (зараз яны знаходзяцца ў фондах музеяў Літвы), а драматург і пісьменнік Францішак Аляхновіч (1883–1944) далучаў гімназістаў да зыходзячых да часоў Адраджэння і Рэфармацыі традыцый беларускафоннага тэатру.



Малюнак 3 – У Беларускай гімназіі, Вільня, сяр. XX ст.



Малюнак 4 – Сучасны выгляд ганка колішняй Беларускай гімнізіі, Вільнюс, 2018

Ад пачатку руху па падрыхтоўцы адкрыцця беларускай гімназіі ў Вільні – да святкавання 100-годдзя гімназіі (2019) Беларусь прайшла шмат сур'ёзных выпрабаванняў (дзве сусветныя вайны, атрымала статус афіцыйнага сябра ААН, стала суверэннай краінай), а этнакультурны асяродак у Вільні, аб стварэнні якога рупіліся браты Луцкевічы, працягвае існаваць дагэтуль. Магчыма таму, што ў сваіх адукацыйна-мастацкіх пачынаннях яны арыентаваліся хутчэй на культуру (мысленне і паводзіны, перадаваемые ў спадчыну), а не на мастацтва (стварэнне творчага прадукта на продаж) ды фармальны піяр (рэкламу, замену зместу дзейнасці дэкларацыямі і слоганамі).

Гэта не было наступствам абмежаванасці ці недасведчанасці. Антон Луцкевіч абсалютна прагматычна агучваў шэраг аб'ектыўных геапалітычных і эканамічных складанасцей (часам дагэтуль актуальных), з якімі мусілі «разабрацца» народ і ўрад суверэннай Беларусі ў працэсе дзяржаўнага будаўніцтва. Але Луцкевічы ведалі, што базавая аснова нацыі – усё ж такі ідэнтычнасць (без яе «не працуюць» ні эканамічныя, ні палітычныя акалічнасці суверэнітэту), якую здольна захаваць толькі нацыянальная культура (як светапогляд і паводзіны). А гістарычны досвед этнасаў-«суседзяў» па мультыкультурнай Вільні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(летувісаў, палякаў, армян, грэкаў, габрэяў) сведчыў, што нацыянальную культуру і этнамастацтва неабходна свядома ахоўваць, а таксама мэтанакіравана перадаваць у спадчыну шляхамі выхавання, адукацыі, сацыялізацыі і інкультурацыі: праз сям'ю і школу. Неўзабаве пра «базавы», «палімерны» (паводле сучаснай навуковай карціны свету) сэнс нацыянальнай культуры і аўтэнтычнага народнага мастацтва ў лёсе народу і дзяржавы шмат пісалі немец Освальд Шпэнглер (1880–1936), брытанец Арнольд Джозэф Тойнбі (1889–1975), а канчаткова падвёў не толькі эстэтычную і геапалітычную, але, нават, біяэнергетычную «роўніцу» пад такімі канцэпцыямі расіянін Леў Гумілёў (1912–1992).

Праз шмат гадоў па закрыцці (падчас II Сусветнай вайны) першай беларускай гімназіі, у Вільнюсе мяжы 1980–90-х гадоў у адным з дзіцячых садочкаў раёна Karaliniškai адкрылася беларуская школа, якая паступова, дзякуючы самаадданым намаганням настаўнікаў і яе першага дырэктара часоў пост-савецкай суверэннай Літвы Галіны Сівалавай (мал. 5), стала гімназіяй ізноў. Варта адзначыць, што, каб адкрыць беларускую навучальную ўстанову ва ўмовах літуанізацыі, складвання дэмакратычных інстытутаў часоў заняпаду камуністычнай ідэалогіі, беларускія настаўнікі літаральна «пешу абыходзілі» сем'і Вільнюса, далучаныя да колішняга беларускага асяродку (…), збіралі пэўную колькасць віленчукоў, жадаючых вучыць уласных дзяцей па-беларуску, што, як паказаў час, не было дарэмным.

У гэтай сітуацыі, як і ў будучай арганізацыі функцыявання гімназіі перадусім як этнакультурнага асяродку, Г. Сівалава праявіла дакладнае разуменне ідэй і падыходаў колішняй супольнасці братоў Луцкевічаў. У арганізацыі «структур паўсядзённасці» аднаўленай навучальнай установы яна арыентавалася на захаванне глыбіннай культуры (мыслення і паводзін) нашага народа, а не на фармальна-знешнія (рэпрэзентатыўна-піярныя, мастацкія) праявы ды стандарты афіцыйнай адукацыі. Паводле дзейнасці педкалектыву гімназіі беларусы атрымалі «выспу» ўласнай культуры і мастацтва пасярод еўраінтэграванай, а таму (пад уціскам еўразвязаўскіх пераналадак) – не надта талерантнай да нелітуанізаваных форм канфігурацыі культур Вільні XXI стагоддзя. Гэта дазволіла, дарэчы, яе сябрам атаясамліваць Г. Сівалаву з амаль эпічным вобразам «белай вароны», як з прынцыпова незалежнай і самадастатковай постаццю, свядома не падуладнай умоўнасцям і ўціску большасці соцыўму, а таксама карпаратыўнай этыцы [3, с. 90].

Больш ёміста ахарактарызаваць чалавека, адначасова кампетэнтнага ў беларусістыцы, еўрапейскім інсітным мастацтве, артэфактах стылю ар-нуво, гісторыі Вільні, акалічнасцях праектнай дзейнасці, практыцы танцаў цэнтральнаеўрапейскіх несценарак на палаючым вуголлі, сучасным фемінізме, а таксама ў валанцёрстве на абшарах адбіваючай знешнюю агрэсію незалежнай Украіны, напэўна, цяжка. Варта адзначыць, што ў выніку намаганняў сучаснага педкалектыву гімназіі (для якога этнакультурны і этнамастацкі ўзровень, некалі зададзены Луцкевічамі, заўжды быў прыярытэтам і мэтай) – разрыў пераемнасці ў этнакультурна-выхаваўчым гімназічным жыцці сярэдзіны XX стагоддзя быў пераадолены, традыцыі і напрамкі ў галіне этнамастацкай адукацыі і этнакультурнага выхавання, запача тканыя Луцкевічамі, – падоўжаныя ў часе і прасторы.



Малюнак 5 – Г. Сівалава, Вільнюс, 2017.
Фота В. Красуліна




Малюнак 6 – Сучасны выгляд ганка Вільнюскай гімназіі імя Ф. Скарыны,
Вільнюс, Sietino gatvė-21, 2018. Фота аўтара

Сёння Вільнюская гімназія імя Францішка Скарыны (Vilniaus Pranciškaus Skorinos gimnazija) – адзіная навучальная ўстанова па-за межамі нашай краіны, у якой можна атрымаць поўную сярэднюю адукацыю на беларускай мове. Тут вучацца каля 200 гімназістаў пераважна беларускага і рускага паходжання, працуюць амаль паўсотні выкладчыкаў. Гімназія (мал. 6) падтрымлівае сувязі з аб'яднаннямі, арыентаванымі на каранёвае мастацтва нашага народа, таму людзі, якія пераймаюць яго па спрадвечна аўтэнтычных правілах – метадам дэманстратыўнай антрапатэхнікі – жаданыя госці ў ёй. Справа ў тым, што 100-гадовы досвед захвання ўласнай супольнасці ў мультыкультурным асяродку Вільні (дзе цягам XX стагоддзя перыядычна прэтэндавалі на грамадска-культурнае дамінаванне палякі, габрэі, летувісы, а апошнія ў выніку, як вядома, перамаглі) дае магчымасць параўнання патэнцыялу формы і зместу якой заўгодна культуры ў доўгачасовай перспектыве. Педагагічны калектыў і гімназісты, сярод якіх захавалася ментальнасць аўтэнтычнага мясцовага беларускага культурнага асяродку – спрактыкаваныя і ўважлівыя гледачы, якія заўжды адрозняць сапраўднае паглыбленне ў традыцыю, яе змест, ад – павярхоўнай (арыентаванай на форму) імітацыі народнага мастацтва. Магчыма, таму кафедра этналогіі БДУКМ, яе студэнты і выпускнікі ўжо больш за дзесяцігоддзе запрашаюцца на галоўныя святы беларусаў – Каляды (мал. 7) і Купалле (мал. 8) – адміністрацыяй і супрацоўнікамі гімназіі, заснаванай некалі братамі Луцкевічамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Малюнак 7 – Каляды ў гімназіі імя Ф. Скарыны, Вільнюс, 2019. Фота А. Карабейкі




Малюнак 8 – Артыкул пра Купалле клуба беларусаў «Siabryna», Вільнюс, 2016



Малюнак 9 – С. Вітушка (1965–2012)



Малюнак 10 – Гуканне вясны ўдзельнікамі аб’яднання «Майстроўня», Мінск, 1983 [2, с. 147]

Варта адзначыць, што беларускі этнакультурны асяродак, захаваны ў Вільнюсе ад часоў актыўнасці Луцкевічаў не быў «самазамкнёны»: на мяжы XX–XXI стагоддзяў ён неаднойчы ўваходзіў у кантакт з суполкамі і асобамі, ахоўваючымі этнакультуру ў самой Беларусі, тым больш, што, як не парадаксальна, лёс апошніх на Радзіме не заўжды быў трыўмфальным і бесперашкодным. Мультыкультурнасць мае і станоўчыя, і адмоўныя моманты: калі ў сучаснай Літве афіцыйна фігуруюць у статыстычных справаздачах па перапісам насельніцтва каля 200 этнасаў, то ў Беларусі іх каля 100, што – таксама нямала. А геапалітычнае становішча краіны «праграмуе» ў ёй перманентную барацьбу нацыянальных інтарэсаў, што фарміруюцца ды йдуць як з Усходу з Захадам, так і з унутраных мясцовых дыяспар. У выніку патрыётам Беларусі, асабліва «на пераломных» момантах яе гісторыі, ва ўласнай краіне не заўжды камфортна і ўтульна, а адзін з магчымых напрамкаў перасоўвання асобы ў такім выпадку – Вільнюс.

На пачатку XXI стагодзя ў гімназіі выкладаў Сяржук Вітушка (мал. 9) – «выціснуты» з Беларусі найбольш харызматычны са стваральнікаў грамадска-культурных мінскіх суполак 1980–90-х «Майстроўня» і «Талака», дзе прадвінутая ўрбанізаваная моладзь (мастакі, архітэктары, лінгвісты, філосафы і юрысты) – пад ашалелае супрадзеянне тагачасовага таталітарнага афіцыёзу, а таксама абыякавае непаразуменне па-спажывецку настроенай большасці ўласнага пакалення – свядома набывала досвед пераймання і захавання нематэрыяльнай (вуснай і неасязаемай) спадчыны свайго народа. А менавіта: каляндарных абрадаў (мал. 10), аўтэнтычных спеваў, традыцыйных гульняў, побытавага танца пад кантанацыйна [4, с. 102] (гукапанарамна) касмалагізуючыя прастору найгрышы літаральна «вырваных з небыцця» (часам – вышуканых па закінутых гарышчах, хлявах і адрынах, рупліва абтрэсеных ад пылу і адноўленых) дуды, колавай ліры, дыятанічных цымбал.

Прайшло тры-чатыры дзесяцігоддзі ад спантаннай актыўнасці «Майстроўні» ды «Талакі», а гісторыка-культурная спадчына Беларусі, за якую яны змагаліся, сёння бярэцца пад ахову; дзейнасць жа, распачатая сто гадоў таму братамі Луцкевічамі, у XXI стагоддзі – падаецца не толькі рамантычнай і прыгожай, але, – афіцыйна лічыцца грамадска-карыснай.

Сёняшні дырэктар беларускай гімназіі Дзіяна Стахновіч і БДУКМ у 2014 годзе падпісалі чарговую дамову аб супрацоўніцтве, што дагэтуль робіць акадэмічны, навучальны і культурны абмен паміж беларускай супольнасцю Вільнюса, а таксама выкладчыкамі, студэнтамі, выпускнікамі ўніверсітэта культуры і мастацтваў плённым і сістэмным, накіраваным на працэс (культуру), а не на асобныя творчыя імпрэзы (акты мастацтва).

З нагоды стогадовага юбілею Беларускай народнай рэспублікі адпачатку 2018 года ўвага грамадства і айчынных СМІ неаднаразова была прыцягнута да дзеячоў нацыянальнага руху,аднымі з найбольш цікавых з якіх, на мой погляд, з’яўляліся Іван і Антон Луцкевічы. Даследчыкі характарызуюць іх як грамадзян, навукоўцаў, адных з пачынальнікаў і ідэолагаў беларускага руху, якія аддавалі сябе цалкам на карысць Айчыны. Бясспрэчна, што па шэрагу вынікаў уласнай дзейнасці іх можна лічыць людзямі, без якіх сучаснай Беларусі, магчыма, і не існавала б. Як не дзіўна, іх пачынанні і метадалогія сацыякультурных практык, зарыентаваныя на «вусную і неасязаемую спадчыну» беларусаў «палімерна» трымаюць своеасаблівыя муры этнакультуры іх Айчыны (ідэнтыфікуючыя беларусаў як асобны народ і нацыю) дагэтуль. На жаль, імёны Луцкевічаў у структурах паўсядзённасці беларусаў сёння амаль не ўзгадваюцца (мо, – табуіраваны), што як мінімум непаважліва, а ў перспектыве – можа быць шкодна станаўленню нашай краіны як адной з еўрапейскіх дзяржаў XXI стагоддзя.

**Спіс літаратуры:**

1. Грейвс, Р. Белая богиня / Роберт Грейвс / пер. с англ. В. Ахтырской. – М. : Иностранка ; Азбука-Аттикус, 2015. – 704 с.
2. Дубавец, С. Майстроўня : гісторыя аднаго цуду / Сяргей Дубавец. – Прага : Радыё Свабода, 2012. – 464 с.
3. Марцінш душ Рэйш, В. Плод авакада / Ванда Марцінш душ Рэйш. – Вільня : Рунь, 2019. – 112 с.
4. Мациевский, И. В пространстве музыки / Игорь Мациевский / ред. А. Тимошенко и др. – СПб. : РИИИ , 2011. – Т. 1. – 203 с. : ил., нот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ